благодарность Витебскому областному музею Героя Советского Союза М.Ф. Шмырёва (на его базе проводилась часть съемок) за сотрудничество, неоценимую помощь, поддержку и открытость к новым нестандартным идеям и проектам».

### О ТРАДИЦИЯХ

У Анны Михайловны пока еще совсем небольшой опыт кураторской работы – всего второй год. Педагог признается, что она довольно строгий преподаватель, но добрый куратор. К ней всегда можно обратиться за советом и попросить помощи в решении той или иной проблемы.

«Ребята очень напоминают мою группу, когда я сама была студенткой, – прокомментировала А.М. Пастернак. – Они все активные, ответственно относятся к учебе, принимают участие во многих факультетских и университетских мероприятиях. Мне с ними очень повезло.

В нашей группе уже есть определенные традиции. Я всегда поздравляю ребят с праздниками, например, с Днем студента, 8 марта, 23 февраля – дарю небольшие сувенирчики, сделанные своими руками. А окончание первого курса мы отмечали чаепитием. Я испекла большой торт, который украсила нашими совместными фотографиями, сделанными на пищевой бумаге, и мы с удовольствием все вместе его съели! Надеюсь, что у меня еще не раз будет повод гордиться своими студентами».

### СТУДЕНТЫ О ПОБЕДЕ

*Илья Кузнецов:*

«Пожалуй, главное, что помогло нам стать лучшей группой, – это личная заинтересованность каждого из нас в том, что мы делаем. Не столько стремление победить или желание кому-то что-то доказать, а тяга к творчеству и интерес к самому процессу».

*Диана Маевская:*

«Мы не ставили перед собой цель победить, скорее это был в некотором роде эксперимент над собой – стремление сделать что-то такое, что зацепит, удивит, заставит задуматься. Судя по всему, у нас это получилось».

*Дарья Правилова:*

«Главный секрет победы – в нас самих. Мы очень хотели что-то сделать, причем, не для конкурса, а для себя. Нам было интересно окунуться с головой в творчество и попробовать себя в роли режиссера, оператора, сценариста, актера... Особенно понравилось то, что мы делали: как придумывали, сочиняли, спорили, шутили и много смеялись. Мы были все вместе, потому и победили».

### ВМЕСТО ЭПИЛОГА

О студентах 21-й группы исторического факультета только самые добрые слова может сказать не только их куратор Анна Михайловна, но и преподаватели, которые с ними работали.

*А.М. Дулаў, кандыдат гістарычных навук, дацэнт, загадчык кафедры гісторыі Беларусі:*

«Мне было вельмі прыемна працаваць з гэтай групай на першым курсе таму што, з аднаго боку, літаральна ва ўсіх студэнтаў прысутнічае зацікаўленасць і асэнсаванае імкненне да набыцця ведаў, а з другога – там пануе дабразычлівая і сяброўская атмасфера. Да таго ж студэнты гэтай групы вылучаюцца творчым падыходам да любой справы, крэатыўнасцю і пазітывам.

Шчыра віншую кожнага са студэнтаў 21-й групы і жадаю новых поспехаў і перамог, дасягнення мэтаў і здзяйснення мараў. І, што вельмі важна, заставацца добрымі людзьмі, захоўваць сяброўства, атрымліваць задавальненне і радасць ад жыцця».

А Юлия Петровна Беженарь обратилась к студентам и преподавателям нашего университета:

«Я бы хотела призвать всех активнее принимать участие в наших традиционных конкурсах. Особенно я хотела бы обратиться к ребятам, которые учатся на ФОИГе и к их кураторам. Уверена, что и им самим будет интересно, и нам, членам жюри.

И, конечно, спасибо нашему ректору В.В. Богатырёвой за возможность материально поощрить победителей, а профкому сотрудников – за купленные цветы. Думаю, все остались довольны».

**Алеся ДУБРОВСКАЯ.**

**Видеоролик «Наша группа лучше всех» исторического факультета смотрите с помощью Qr-кода.**

ШКОЛА – УНІВЕРСІТЭТ

# ПАКАЗАЛІ ДОБРЫ ЎЗРОВЕНЬ ПАДРЫХТОЎКІ

***У сярэдзіне мая прайшоў заключны этап рэспубліканскай алімпіяды па 18 вучэбных прадметах. У гэтым годзе ў ім прымалі ўдзел толькі вучні 11-х класаў.***

Заключны этап рэспубліканскай алімпіяды па рускай мове і літаратуры адбыўся ў Бабруйску. Удзельнікам неабходна было напісаць водгук на літаратурны твор і зрабіць комплексную працу з заданнямі па рускай мове і літаратуры.



**Сяргей Уладзіміравіч НІКАЛАЕНКА, дэкан філалагічнага факультэта, доктар педагагічных навук, прафесар, старшыня журы заключнага рэспубліканскага этапа алімпіяды для школьнікаў па вучэбных прадметах «Руская мова» і «Руская літаратура»:**

«З 2007 года я з'яўляюся членам журы рэспубліканскага этапа алімпіяды, у гэтым годзе, напрыклад, быў старшынёй. І трэба адзначыць: штогод узровень школьнікаў павышаецца. Веды ў галіне лінгвістыцы ў навучэнцаў, на маю думку, такія ж як у студэнтаў-выпускнікоў профільнага факультэта. Адразу бачны высокі мэтанакіраваны і сістэмны ўзровень падрыхтоўкі да алімпіяды. Вучні ставяць мэту – паказаць добры вынік і перамагчы. Гэта значыць, што яны ўмеюць працаваць з літаратурай і з іншымі крыніцамі інфармацыі, выбіраць і захоўваюць звесткі, якія атрымалі ў школе.

Самы складаны для вучняў, на мой погляд, – абласны этап рэспубліканскай алімпіяды. Таму што толькі за першае месца там можна атрымаць вынік у 100 балаў. З заключнага этапа рэспубліканскай алімпіяды вучні абавязкова прывозяць 45% дыпломаў I, II, III ступені, а гэта аўтаматычны 100-бальны вынік на ЦТ па рускай мове».

(Заканчэнне на 6-й стар.).

# ПАКАЗАЛІ ДОБРЫ ЎЗРОВЕНЬ ПАДРЫХТОЎКІ

**(Заканчэнне. Пачатак на 5-й стр.)**

*Заключны этап алімпіяды па вучэбным прадмеце «Фізічная культура і здароўе» праходзіў у Гродна. Гэтая алімпіяда праводзілася толькі ў другі раз.*

*Навучэнцы паказалі не толькі свае тэарэтычныя веды па дадзеным вучэбным прадмеце, але і прадэманстравалі сваю фізічную падрыхтоўку.*

*Першы этап алімпіяды ўключаў у сябе тэорыю. На другім – школьнікі паказвалі ўзровень фізічнай падрыхтоўкі, выконвалі тэставыя заданні: чаўночны бег 4х9 м, скачок у даўжыню з месца, падцягванне на высокай перакладзіне (тэст для юнакоў), падыманне і апусканне тулава за 1 хвіліну (тэст для дзяўчат) і нахіл уперад са становішча, седзячы на падлозе.*

*Трэці этап – спартыўныя гульні. Гэта было комплекснае практыкаванне, якое складалася з 4 спартыўных гульняў (баскетбол, гандбол, футбол і валейбол). Ацэньвалася хуткасць і якасць выканання комплекснага практыкавання.*



**Марына Віктараўна ПАРАХОЎСКАЯ, старшы выкладчык кафедры спартыўна-педагагічных дысцыплін факультэта фізічнай культуры і спорту, старшыня журы заключнага рэспубліканскага этапа алімпіяды для школьнікаў па вучэбным прадмеце «Фізічная культура і здароўе»:**

«Узровень падрыхтоўкі школьнікаў высокі, што было добра бачна падчас выканання нарматываў і правядзення спартыўных гульняў. Крыху горш можна ацаніць тэарэтычны ўзровень ведаў адзінаццацікласнікаў. Комплекснае практыкаванне – у значнай ступені складанае заданне, таму што навучэнцам неабходна выканаць без памылак шмат тэхнічных элементаў з розных відаў. У некаторых школьнікаў гэта добра атрымалася, і яны набралі бонусныя балы.

У гэтым годзе Раман Магіленкоў з Дуброўна нават устанавіў рэкорд па тэставым практыкаванні «Скачок у даўжыню». Ён паказаў вынік 303 см. А Уладзіслаў Хмялеўскі з сярэдняй школы № 4 г. Наваполацка быў узнагароджаны дыпломам III ступені».



**Уладзімір Максімавіч ГЕНКІН, кандыдат філалагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры агульнага і рускага мовазнаўства філалагічнага факультэта, член журы заключнага рэспубліканскага этапа алімпіяды для школьнікаў па вучэбных прадметах «Руская мова» і «Руская літаратура»:**

«Узровень падрыхтоўкі школьнікаў 11 класа вельмі высокі, у іх багаты вопыт і шматгадовая мэтанакіраваная падрыхтоўка. Навучэнцы паказалі добрыя веды рускай мовы і літаратуры. У гэтым годзе члены каманды Віцебскай вобласці прывезлі з сабой 5 дыпломаў ад I да III ступені.

У маёй практыцы сустракаліся і спрэчныя выпадкі. Не заўсёды адказ можа быць на 100% адназначным. Напрыклад, пры пастаноўцы націску часта ўзнікаюць праблемы. У слоўніках прапісаны правільны варыянт, а школьнік можа паставіць націск па нормах гутарковай мовы. Таксама не заўжды можна даваць адназначныя ацэнкі адносна літаратурных твораў, якія прапануюцца для водгукаў. Тут часта ўзнікае магчымасць індывідуальнага падыходу. Але, як правіла, я імкнуся вырашаць такія пытанні на карысць удзельніка алімпіяды».

*Заключны этап рэспубліканскай алімпіяды па замежных мовах праходзіў у Мазыры.*

*На працягу двух дзён старшакласнікі дэманстравалі свае веды па англійскай, нямецкай, іспанскай, французскай і кітайскай мовах.*

*На базе нашага ўніверсітэта школьнікі два тыдні займаліся французскай мовай. У падрыхтоўцы былі задзейнічаны выкладчыкі французскай мовы кафедры сусветных моў філалагічнага факультэта: Марына Леанідаўна Дарафеенка, Алена Мікалаеўна Якаўлева-Юрчак і Ганна Сяргееўна Булыня.*



**Марына Леанідаўна ДАРАФЕЕНКА, кандыдат філалагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры сусветных моў:**

«Заняткі са школьнікамі мы стараліся праводзіць у розных формах для ўдасканалення іх навыкаў па розных відах маўленчай дзейнасці (успрыманне і разуменне мовы на слых, гаварэнне, чытанне, пісьмо і пісьмовае маўленне).

На маю думку, узровень валодання французскай мовы з года ў год паляпшаецца. Навучэнцы прыходзяць да нас на заняткі ўсё больш і больш падрыхтаваныя. Менавіта па гэтай прычыне мы заўсёды атрымліваем добрыя вынікі.

Фактычна кожны год школьнікі з Віцебскай вобласці прывозяць дыпломы з заключнага этапа рэспубліканскай алімпіяды. У гэтым годзе Віцебшчыну прадстаўлялі тры адзінаццацікласніка. Двое з іх атрымалі дыпломы (I і III ступені)».

**Меркаванні збірала Алеся МЯДЗІЛЬ.**
**Фота VSU.by**